УДК 331.105

# Прафсаюзы і рэгуляванне працоўных канфліктаў ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі

Дубовік А. А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Працоўныя канфлікты ў перыяд НЭПа мелі розную прыроду і ступень вастрыні. Большасць з іх уяўляла сабой працоўныя спрэчкі паміж працоўнымі і наймальнікамі і можа быць названа канфліктамі толькі ўмоўна, паколькі пры іх праца не спынялася, не губляўся ніводны рабочы дзень. Зусім іншая рэч, калі справа даходзіла да забастовак. На думку некаторых даследчыкаў, іх больш правільна называць сацыяльна-працоўнымі канфліктамі. Пазіцыя прафсаюзаў адносна працоўных канфліктаў вызначалася дзяржаўнай палітыкай у галіне працы. Важная задача, якую партыйна-савецкае кіраўніцтва паставіла перад прафсаюзамі, заключалася ў пасрэдніцтве ў вырашэнні канфліктных сітуацый. Яе рашэнню садзейнічала стварэнне і дзейнасць парытэтных органаў наймальнікаў і прафсаюзаў – расцэначна-канфліктных камісій, прымірыцельных камер і трацейскіх судоў. Аднак шмат канфліктаў прыходзілася вырашаць самім прафсаюзным органам. У асноўным адбывалася гэта ў першыя гады НЭПа, калі сістэма парытэтных органаў прымірыцельна-трацейскага разбору канфліктаў яшчэ не аформілася.

Асаблівасцю перыяду НЭПа была наяўнасць сацыяльна-працоўных канфліктаў на прадпрыемствах розных форм уласнасці. Палітыка прафсаюзаў у дачыненні да працоўных канфліктаў адрознівалася на дзяржаўных і прыватных прадпрыемствах. Калі на першых акцэнт рабіўся на папярэджанні канфліктаў ці іх хутчэйшым вырашэнні для эканамічнай стабільнасці, дык у адносінах да прыватнага капіталу прафсаюзы на першае месца ставілі абарону інтарэсаў наёмных працаўнікоў і пры іх парушэнні выступалі арганізатарамі забастовак пратэсту. У асноўных параметрах статыстыка прычын сацыяльна-працоўных канфліктаў па Беларусі супадала з агульнай па краіне. Аднак настроі рабочых у БССР былі менш палітызаваны, чым у прамыслова развітых раёнах СССР, таму насілі ў асноўным эканамічны характар. Забастоўкі звычайна працягваліся кароткі час. У абсалютнай большасці выпадкаў канфлікты вырашаліся на карысць рабочых. Аслабленне дзейнасці органаў парытэтна-трацейскага вырашэння працоўных канфліктаў па прычыне перадачы іх паўнамоцтваў судовым органам, што адбывалася ў канцы 1920-х гг. у сувязі з узмацненнем адміністрацыйных метадаў кіравання эканомікай, звузіла магчымасці ўдзелу прафсаюзаў у рэгуляванні працоўных адносін.